нага асабовага імені ці мянушкі, найменш распаўсюджаны сярод людзей ва ўзросце да 20 гадоў (зафіксавана ўсяго 6 адзінак).

Другой па колькасці з'яўляецца група антрапонімаў, што ўзніклі ў выніку розных выпадкаў з жыцця носьбіта (26 адзінак са 125, ці 20,8% ад усіх). Да гэтай групы мы аднеслі мянушкі *Пракурор, Трынаццаты, Нармалёк, Паравоз* (мужчына па імені Мікола носіць гэтую мянушку з дзіцячага ўзросту, ад яе ўтварылася мянушка старэйшай дачкі – *Паравозіха* і малодшай дачкі – *Электрычка), Гоша, Бібік, Падплятанка.* Носьбіты антрапонімаў названай групы маюць узрост ад 25 да 58 гадоў. Найменні такога характару не вельмі папулярныя ў людзей ва ўзросце больш за 60 гадоў.

Трэцяй па колькасці з'яўляецца група мянушак, дадзеных па знешнасці носьбіта (22 адзінкі са 125, ці 17,6% ад усіх). Мянушкі, дадзеныя па росце і целаскладзе, характарызуюць людзей невысокага росту *(Сына, Шыцік, Шкет, Карот),* паўнаватага целаскладу *(Пончык, Кумпяк, Кабан),* худога целаскладу *(Дрында, Дрыня).* Намі выдзелены найменні, што характарызуюць рост і целасклад, асаблівасці частак цела, наяўнасць валасоў і іх колер, вопратку і асаблівасці хады. Узроставы дыяпазон носьбітаў названай групы – ад 17 да 78 гадоў. Аднак людзям рознага ўзросту такія адзінкі ўласцівы не ў аднолькавай ступені: найбольш яны характэрны для асоб узроставай катэгорыі ад 17 да 43 гадоў (18 з 22). Найменш уласцівы антрапонімы, дадзеныя па знешнасці, людзям старэйшым: ад 43 да 78 (3 адзінкі з 22).

Чацвёртую па колькасці групу складаюць онімы, якія апісваюць рысы характару чалавека. У названую групу намі было ўключана 11 антрапонімаў са 125, што складае 8,8% ад усіх. Сярод адзінак, якія апісваюць носьбіта па асаблівасцях паводзін, намі былі зафіксаваны наступныя мянушкі: *Ганс* – хітры мужчына, *Курыца* – хлопец недалёкага розуму, *Страіцель* – мянушку атрымала дзяўчына, якая заўсёды гучна гаворыць (як на будоўлі падчас працы, калі шумяць розныя машыны і прыстасаванні). Мянушкі прааналізаванай групы характарызуюць людзей хітрых, вясёлых, злых, эмацыйных, разумных і неразумных. Як бачна, найменні характарызуюць носьбіта як са станоўчага боку, так і з адмоўнага. Сустракаюцца мянушкі, якія сведчаць пра іранічныя адносіны да іх носьбітаў. Сярод носьбітаў мянушак прааналізаванай групы найбольшую колькасць складаюць людзі ва ўзросце ад 25 да 43 гадоў (9 адзінак з 11).

Пятую групу неафіцыйных найменняў утвараюць адзінкі, дадзеныя па схільнасці да харчовых прадуктаў і напояў. Група ўтрымлівае 2 (ці 1,6% ад усіх) антрапонімы: *Сялёдка* – мужчына вельмі любіць сялёдку, мянушку атрымаў яшчэ у маладым узросце ад сяброў; *Страх* – мужчына мае схільнасць да алкагольных напіткаў ("калі нап'ецца, то становіцца буйным, усім становіцца вельмі страшна ад яго выгляду"). Носьбітамі найменняў гэтай групы з'яўляюцца асобы мужчынскага полу рознага ўзросту (ад 24 да 40 гадоў).

**Заключэнне.** Такім чынам, мянушкі жыхароў Лепельшчыны дастаткова разнастайныя па прыкметах, пакладзеных у іх аснову. Найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца мянушкі адантрапанімнага характару. Самымі нешматлікімі – адзінкі, дадзеныя па схільнасці да харчовых прадуктаў і напояў, онімы, што апісваюць рысы характару чалавека. Мянушкі ўжываюцца ў дачыненні да асоб ад дваццаціпяці- да шасцідзесяцігадовага ўзросту.

Адны з неафіцыйных найменняў існуюць непрацяглы час і хутка знікаюць, другія – усё жыццё носьбіта, трэція – перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

На Лепельшчыне бытуюць як індывідуальныя мянушкі, што называюць канкрэтнага чалавека, так і групавыя (сямейныя), якія называюць некалькі чалавек (напрыклад, *Бібікі* – так называюць усіх членаў сям'і, *Шпачкі* – ад бацькі мянушка перайшла дзецям і іншым сваякам). Індывідуальныя онімы пераважаюць над сямейнымі па той прычыне, што вылучаюць, характарызуюць, індывідуалізуюць чалавека.

Літаратура:

1. Бірыла, М.В. Беларуская антрапанімія 1: Уласныя імёны, імёны-мянушкі, імёны па бацьку, прозвішчы / М.В.Бірыла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 508 с.
2. Мезенка, Г.М. Беларуская антрапанімія: вучэбны дапаможнік / Г.М.Мезенка. – Віцебск: Выдавецтва ВДУ імя П.М.Машэрава, 2009. – 254 с.
3. Юрэвіч, У.М. Слова жывое, роднае, гаваркое. [Тэкст]: Дапам. для настаўнікаў / У.М.Юрэвіч. – Мн.: Маст. літ., 1998. – 282 с.

## АСАБЛІВАСЦІ СТРУКТУРЫ СУЧАСНЫХ СЕТКАВЫХ НАЙМЕННЯЎ

***Гугалінская Т.А.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Семянькова Г.К., канд. філал. навук, дацэнт

Апошняе дзесяцігоддзе адзначылася бурным развіццём сродкаў і спосабаў перадачы інфармацыі. Зараз камунікацыя адбываецца дзякуючы камп'ютарнай тэхніцы, у тым ліку інтэрнэту. Сёння інтэрнэт з'яўляецца неад'емнай часткай культуры грамадства, адным з асноўных элементаў развіцця цывілізацыі. Любы чалавек, заходзячы ў інтэрнэт-прастору, павінен стварыць сабе імя для віртуальных зносін. Узнікненне камп'ютарных імёнаў абумоўлена неабходнасцю ідэнтыфікацыі карыстальніка ў межах адной віртуальнай прасторы – блога, чата, канферэнцыі. Калі раней чалавеку трэба было "адпавядаць" свайму



Рэпазіторый ВДУ

імені, то цяпер імя ў інтэрнэце – матэрыял для стварэння самога сябе. Цікавасць да спецыфікі сеткавых імён непазбежна вядзе да праблемы вывучэння іх разнастайнасці. Усё сказанае дае падставы сцвярджаць, што актуальнасць і цікавасць да вывучэння сеткавых найменняў узрастае з кожным годам.

Мэта публікацыі – вызначыць асаблівасці структуры сучасных сеткавых найменняў (нікнэймаў).

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання паслужыла картатэка нікнэймаў, сабраная аўтарам падчас зносін з карыстальнікамі сеціва (усяго 190 адзінак). Выкарыстаны апісальны метад даследавання.

**Вынікі і абмеркаванне.** Нік (нікнэйм, сеткавае імя) – адна з важных антрапанімічных адзінак, якая дазваляе камунікантам, носьбітам інтэрнэт-прасторы ажыццяўляць зносіны паміж сабой. Выбар ніка – элемент творчай гульні, у якім кожны імкнецца быць арыгінальным. Адным з самых галоўных адрозненняў сеткавага псеўданіма ад іншых антрапанімных адзінак з'яўляецца патрабаванне яго непаўторнасці, унікальнасці ў межах аднаго чата, форума, блога. З-за пісьмовага характару камунікацыі кожны нік павінен адрознівацца ад астатніх сваім графічным афармленнем.

Аналізуючы фактычны матэрыял, асаблівую ўвагу мы звярнулі на структуру нікнэймаў. Усе сабраныя нікнэймы (190 адзінак) мы раскласіфікавалі на тры групы ў залежнасці ад асаблівасцяў структуры адзінак: 1) нікі, што складаюцца з аднаго слова; 2) назвы, што ўтвараюцца з двух слоў; 3) найменні, якія складаюцца з трох і больш слоў.

Група ***нікаў, што складаюцца з аднаго слова,*** дастаткова шматлікая (63 адзінкі): *super; best; pokemon; Madonna; OLEG.* Такія нікі вельмі папулярныя на форумах, у розных чатах, блогах. У названай групе былі вылучаны наступныя падгрупы:

а) *нікнэймы складаюцца з адной лексічнай адзінкі і запісаны лацінскімі літарамі: MeLisa; Beautiful; Serge; alligator; DrOzd;*

б) *найменні складаюцца з адной лексічнай адзінкі і запісаны кірылічнымі літарамі: восточный; гламурная; игривый; Цукерка;* такія нікі лёгка ўспрымаюцца і чытаюцца;

в) *імёны складаюцца з адной лексічнай адзінкі і запісаны вялікімі літарамі: ZLOY; MANDARIN; ИРИША; НЕОБЫЧНАЯ;* падргупа невялікая па колькасці;

г) *імёны, якія змяшчаюць спалучэнне вялікіх і малых літар: ТаНюШкА; КуКуРуЗа; неАнгел; DrOzd;*

д) *адна лексічная адзінка і ніжняе падкрэсліванне: e_v_d_a; ROMEO_; _B_O_Y_; _D_e_N_4_I_K;_koFFe_; phil_; _ПечеНЮшка_; МыЖкА_; KiSS_Ka; аТмО_Сфера; П_о_з_и_т_и_в_ЧИК;*

е) *складаюцца з адной лексічнай адзінкі і сімвала: =Дианочка=; $Волчица$; $Кокета$.*

ё) *нік складаецца з лексічнай адзінкі, утворанай пры дапамозе сімвалаў, якія замяшчаюць пэўную літару ў слове*: *pr!zrak; ArTeMk@; M@ЛиНкА; Ки$улька; Ин}{ог]-[ито; $4@(тлив@Я.*

ж) найменні, у складзе якіх вылучаецца *дзве лексічныя адзінкі, але ўспрымаецца нікнэйм як адно слова: doringerl; ianalundov; tatoomolodost;* сюды ж мы аднеслі найменні, *у складзе якіх вылучаецца лексічная адзінка і лічэбнік: myrka1995; Micha08; Katty2424; agent007; Tlen111.*

***Сеткавыя імёны, што складаюцца з двух слоў,*** таксама даволі шырока прадстаўлены ў нашым матэрыяле (36 адзінак). Тут вылучаюцца падгрупы найменняў, у якіх кожнае слова запісана з вялікай *(Иван Петрович; Евгений Онегин; Мистер Зло)* і з малой літары *(четкий.чел; кусочек щастья),* са спалучэння вялікіх і малых літар *(ищет ПрИкЛючений),* раздзеленых ніжнім падкрэсліваннем *(Co_Co nastya_rmnvsk; NATALIA_ORIERO; Vova_Putin).*

***Найменні, якія складаюцца з трох і больш слоў,*** нешматлікія па колькасці. Зафіксаваны наступныя адзінкавыя прыклады: *Замок_на_песке; они_убили_Кенни; Princ_Na_Belom_BMW.*

**Заключэнне.** Такім чынам, прааналізаваныя сеткавыя імёны разнастайныя па сваёй структуры. Унікальнасць, непаўторнасць нікаў дасягаецца выкарыстаннем розных памераў шрыфтоў, сімволікі, значкоў, ужываннем вялікіх літар для ўсяго слова ці яго часткі, змешваннем вялікіх і малых літар, ніжнім падкрэсліваннем для паказу мяжы паміж словамі, адсутнасцю інтэрвалаў паміж словамі, графікай лацінскіх ці кірылічных літар у напісанні цэлых слоў. Усе пералічаныя спосабы афармлення найменняў шырока выкарыстоўваюцца ў інтэрнэт-зносінах. Такія асаблівасці афармлення найменняў ствараюць дадатковую стылістычную інфармацыю ніка, ілюструюць жывую і яркую асобу камуніканта.

Літаратура:

1. Барковіч, А. Адукацыйны дыскурс інтэрнэту / А. Барковіч // Роднае слова. – 2015. – № 11. – С. 32–35.
2. Барковіч, А. Інтэрнэт і моўная асоба / А. Барковіч // Роднае слова. – 2014. – № 8. – С. 31–33.
3. Барковіч, А. Родная мова ў Інтэрнэце / А. Барковіч // Роднае слова. – 2005. – № 12. – С. 87–90.

Репозиторий ВГУ